УДК 37.014:37.1.08(476) «19»

**В. М. Астрога**
Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт

# АДУКАЦЫЙНАЯ І КАДРАВАЯ ПАЛІТЫКА ЦАРЫЗМУ Ў БЕЛАРУСІ Ў ПАЧАТКУ ХХ СТ.

У артыкуле разглядаецца адукацыйная і кадравая палітыка царызму ў Беларусі ў пачатку ХХ ст. Вывучэнне дадзенай праблемы дае магчымасць больш поўна і глыбока даследаваць развіццё сістэмы народнай адукацыі, паказаць ролю грамадска-педагагічнага руху ў барацьбе з рэакцыйнай лініяй самаўладдзя. На канкрэтных прыкладах аўтар паказвае, што курс урада быў накіраваны на захаванне саслоўнай школы і існуючых парадкаў. Аналізуюцца статыстычныя даныя аб колькасці навучальных устаноў, вучняў і настаўнікаў. На канкрэтных даных прыводзіцца «паказчык увагі» дзяржавы да школы і яе настаўніка. Падкрэсліваецца дваістасць і непаслядоўнасць урадавай адукацыйнай палітыкі, яе саслоўны характар і нерашучасць у многіх пачынаннях, спазненне за тэмпам і ўзроўнем развіцця ў параўнанні з краінамі Захаду. Асноўныя палажэнні і вывады грунтуюцца на аналізе нарматыўна-прававых актаў, даных статыстыкі, матэрыялаў перыядычнага педагагічнага друку і архіўных крыніц.

**Ключавыя словы:** адукацыйная палітыка царызму, навучальныя ўстановы, настаўніцтва, Віленская навучальная акруга, грамадска-педагагічны рух, сістэма народнай асветы.

**Для цытавання:** Астрога В. М. Адукацыйная і кадравая палітыка царызму ў Беларусі ў пачатку ХХ ст. // Труды БГТУ. Сер. 6, История, философия. 2022. № 2 (263). С. 21–26.

**V. M. Ostroga**
Belarusian State Technological University

# EDUCATIONAL AND PERSONNEL POLICY OF CZARISM IN BELARUS AT THE BEGINNING OF THE XX CENTURY

The article examines the educational and personnel policy of tsarism in Belarus at the beginning of the 20th century. The study of this problem provides an opportunity to more fully and deeply investigate the development of the public education system, to show the role of the social-pedagogical movement in the fight against the reactionary line of self-government. Using specific examples, the author shows that the course of the government was aimed at preserving the class school and the existing order. Statistical data on the number of educational institutions are analyzed. Pupils and teachers. Specific data shows the state's «attention rate» to the school and its teacher. Emphasized the duality and inconsistency of the government's educational policy, its class character and indecisiveness in many undertakings, lagging behind the pace and level of development compared to Western countries. The main provisions and conclusions are based on the analysis of regulatory and legal acts, statistical data, materials of periodical pedagogical publications and archival sources.

**Keywords:** educational policy of tsarism, educational institutions, mentoring, Vilnius educational district, social and pedagogical movement, system of public education.

**For citation:** Ostroga V. M. Educational and personnel policy of czarism in Belarus at the beginning of the XX century. *Proceedings of BSTU, issue 6, History, Philosophy*, 2022, no. 2 (263), pp. 21–26 (In Belarusian).

**Уводзіны.** Народная асвета ў другой палове ХІХ – пачатку ХХ ст. адставала ад патрабаванняў часу і становілася відавочнай перашкодай на шляху эканамічнага і культурнага прагрэсу. На павестку дня востра паўставала праблема ўвядзення ўсеагульнай адукацыі і, наогул, карэннай перабудовы школы з мэтай прывядзення яе ў адпаведнасць з культурнымі патрэбамі грамадства. Дзяржаўная адукацыйная палітыка непасрэдна ўплывала на тэорыю і практыку навучальнага і выхаваўчага працэсу, яе накірункі, метады і сродкі ажыццяўлення выступалі ў якасці непасрэднага ўвасаблення палітычных установак разглядаемага часу. Нягледзячы на спробы мадэрнізацыі і рэфармавання, сістэма народнай асветы Беларусі характарызавалася строгім кантролем з боку міністэрскіх чыноўнікаў, адсутнасцю вышэйшых навучальных устаноў і пераемнасці паміж пачатковай і сярэдняй школай, захаваннем прывілей для маёмасных слаёў у атрыманні сярэдняй адукацыі, шматтыпнасцю ніжэйшых навучальных

устаноў, іх падначаленасцю розным міністэрствам і ведамствам.

**Асноўная частка.** На тэрыторыі Беларусі развіццё адукацыі мела некаторыя адрозненні ў параўнанні з арганізацыяй сістэмы асветы у цэнтральных расійскіх губернях. Асноўныя накірункі развіцця народнай адукацыі і кадравага забеспячэння ў многім вызначала нарматыўна-прававая база, выпрацаваная і замацаваная царызмам ў другой палове XIX ст.: для Віленскай навучальнай акругі захоўваліся асобыя палажэнні, правілы, статуты, сваё адміністрацыйнае кіраванне і розныя крыніцы адкрыцця і ўтрымання навучальных устаноў. Расходы на народную асвету у беларускіх губернях адрозніваліся сваёй мізэрнасцю: згодна з данымі на 1 студзеня 1899 г., у Віцебскай губерні на душу насельніцтва яны складалі 25,5 кап., Гродзенскай – 19,3 кап., Мінскай – 18,7, Магілёўскай – 10,8 (у іншых губернях Расіі, для параўнання, у сярэднім 36,1 кап.) [1, с. 52–53].

У пачатку XX ст. сістэма ніжэйшых навучальных устаноў заставалася складанай і налічвала 17 тыпаў [2, с. 125]. Характэрнай адметнасцю развіцця народнай адукацыі Беларусі з'яўлялася тое, што ў гэты час тут дзейнічала значна больш пачатковых навучальных устаноў ведамства Св. Сінода, чым міністэрскіх. Урад, у сваю чаргу, імкнуўся да іх пашырэння ў губернях з перавагай праваслаўнага насельніцта (Магілёўскай, Віцебскай і Мінскай). Гэта знайшло адлюстраванне ў іх падтрымцы і фінансаванні. На піку свайго развіцця ў 1905 г. працавала 4990 царкоўных школ з 156 812 навучэнцамі. Пасля рэвалюцыі іх колькасць паступова скарацілася з 4027 школ з 143 670 навучэнцамі у 1908 г. да 2813 школ з 136 900 навучэнцамі ў 1914 г. [3, с. 374].

Дастаткова хуткімі тэмпамі пачала развівацца сетка пачатковых народных вучылішчаў, якія знаходзіліся ў падпарадкаванні Міністэрства народнай асветы. Іх колькасць узрасла з 1314 (106 196 навучэнцаў) у 1905 г. да 4784 (304 745 навучэнцаў) у 1914 г. Сярод іх найбольш распаўсюджанымі былі вясковыя аднакласныя народныя вучылішчы. Значна павялічылася і колькасць гарадскіх вучылішчаў: з 39 да 82, а вучняў – з 7344 да 12 432 чалавек [3, с. 371, 379]. Нягледзячы на магчымасць атрымання павышанай пачатковай адукацыі, выпускнікі гарадскіх вучылішчаў не мелі права пераходу ў сярэднія навучальныя ўстановы.

Сістэму ніжэйшай адукацыі Віленскай навучальнай акругі дапаўняла таксама значная колькасць яўрэйскіх вучылішчаў – 3328 (з іх 3050 хедэраў), 6 вучылішчаў ведамства імператрыцы Марыі і 7 вучылішчаў ваеннага міністэрства [4, с. 32–33]. У пачатку XX ст. назіраўся рост чыгуначных школ і прафесійных вучылішчаў, рамесніцкіх класаў пры гарадскіх вучылішчах і інш.

Адносіны ўрада да народнай асветы асабліва яскрава праяўляліся праз адносіны да настаўніцтва. У 1904 г. у пачатковых навучальных установах Віленскай навучальнай акругі працавалі 6664 настаўнікі, у тым ліку: у гарадскіх аднакласных вучылішчах – 654 чалавекі, двухкласных – 504, у гарадскіх вучылішчах па палажэнні 1872 г. – 723, у сельскіх аднакласных – 4278, двухкласных – 308. Яшчэ 35 настаўнікаў выкладалі ў нядзельных школах і на вячэрніх курсах для дарослых [5, с. 128–131].

Узровень падрыхтоўкі настаўніцкіх кадраў у другой палове XIX ст. адлюстроўваў барацьбу прагрэсіўных сіл грамадства і рэакцыі. У гэты час вышэйшых педагагічных навучальных устаноў на тэрыторыі Беларусі не было і толькі ішоў працэс фарміравання сярэдніх педагагічных навучальных устаноў: у 1916 г. працавалі 9 настаўніцкіх семінарый, 3 настаўніцкія інстытуты, 7 двухгадовых педагагічных курсаў, 7 педагагічных класаў пры жаночых гімназіях. Мала клапаціла ўрадавых чыноўнікаў і матэрыяльная незабяспечанасць народнага настаўніцтва: у пачатку XX ст. рабочыя многіх галін прамысловасці зараблялі больш за педагогаў [6, с. 436.]

2 красавіка 1903 г. у Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях былі ўведзены упраўленні па справах земскай гаспадаркі (у 34 губернях цэнтральнай Расіі яны існавалі з 1864 г.). Нягледзячы на абмежаванасць іх правоў і магчымасцей, яны ўсё ж такі адыгралі станоўчую ролю ў развіцці народнай асветы. Справа з увядзеннем земстваў адлюстроўвала адносіны ўрада да адукацыі, самакіравання ў беларускіх губернях, да польскага дваранскага і каталіцкага ўплыву. Гэтыя органы ствараліся не выбарным шляхам, а камплектаваліся з чыноўнікаў розных устаноў. Міністэрства асветы планавала за земскімі ўстановамі пакінуць адну гаспадарчую частку і клопат пра матэрыяльнае забеспячэнне навучальных устаноў, а адміністрацыйнае кіраўніцтва трымаць у сваіх руках. У такім выпадку настаўнік хоць і мог выбірацца земствам, але дапускаўся да працы толькі інспектарам. Такім чынам, у адрозненне ад земскіх школ Расіі. гарадскія і сельскія грамадзяне да кіраўніцтва гэтых навучальных устаноў не дапускаліся.

Разам з тым земствы дастаткова актыўна ўключыліся ў справу: вывучалі і аналізавалі стан народнай адукацыі, адкрывалі новыя навучальныя ўстановы і ўтрымлівалі іх, назначалі стыпендыі выхаванцам настаўніцкіх семінарый. Даволі часта яны з'яўляліся арганізатарамі

педагагічных курсаў, з’ездаў і нарад настаўнікаў, забяспечвалі школы вучэбна-метадычнымі дапаможнікамі. выдзялялі грашовую дапамогу настаўнікам, бо добра разумелі, што «недастатковая забяспечанасць адбіваецца на самім складзе асоб, якія ідуць на службу» [7, л. 107.]. Так, Гомельскае земства ў 1912 г. выдзеліла на папаўненне фондаў школьных бібліятэк 2220 руб., на набыццё «чароўных ліхтароў», светлавых карцінак і арганізацыю народных чытанняў – 1103 руб. Клімавіцкае земства стала ініцыятарам і фундатарам адкрыцця педагагічных курсаў. Павысіць узровень тэарэтычных і практычных ведаў і ўменняў, у тым ліку і па асновах сельскай гаспадаркі, змаглі 70 народных настаўнікаў. Магілёўскае земства, у тым ліку, праектавала адкрыць у губерні 25 настаўніцкіх семінарый, штогод па дзве, і склала ўзорны праект сеткі гэтых навучальных устаноў [8, с. 141]. Толькі ў 1914 г. у Полацкай настаўніцкай семінарыі былі зацверджаны 53 земскія стыпендыі са штогадовым выдзяленнем з земскіх сродкаў па 5300 руб. Акрамя гэтага, Віцебскае губернскае земства ўтрымлівала 11 стыпендыятаў з ліку дзяцей настаўнікаў земскіх школ, якім выдавалася па 60 руб. у год на іх утрыманне ў сярэдніх навучальных установах [9, с. 27, 85.]. У разглядаемы час актыўна абмяркоўваўся праект аб усенавучы і ролі ў ім настаўніка. Земствы сваёй дзейнасцю стрымлівалі рост царкоўных школ, памяншаючы на іх выдаткі і адкрываючы свае. У Магілёўскай губерні, дзе школ духоўнага ведамства было больш, чым у іншых губернях, нават адбываліся сутыкненні пры абмеркаванні сеткі ўсеагульнага навучання [10, л. 24]. Напярэдадні Першай сусветнай вайны большасць міністэрскіх школ фінансавалася за кошт земскіх сродкаў.

Нягледзячы на патрабаванні шырокіх колаў грамадства, яшчэ пачынаючы з 1860-х гг. закон аб увядзенні ўсеагульнай адукацыі на тэрыторыі імперыі адсутнічаў. Гэта абумоўлівала стыхійнасць у развіцці і пашырэнні школьнай сеткі. Адкрыццё новых навучальных устаноў па-ранейшаму ў многім залежала ад фінансавых магчымасцей сялян і выдаткаў земскіх органаў, а не ад рэальных патрэб ахопу адукацыяй дзяцей школьнага ўзросту. Таксама забаранялася адкрываць навучальныя ўстановы там, дзе ўжо існавалі ці планаваліся царкоўныя школы. Колькасць навучэнцаў у розных воласцях, паветах і губернях мела значныя адрозненні. Так, у канцы 1913 г. у беларускіх паветах Віленскай губерні вучылася 3,12%, у Віцебскай – 4,84%, у Магілёўскай – 6,78% насельніцтва [3, с. 341].

На тэрыторыі Беларусі не існавала адзінай сярэдняй агульнаадукацыйнай школы. Галоўнымі яе тыпамі з'яўляліся мужчынскія гімназіі, мужчынскія рэальныя вучылішчы і жаночыя гімназіі; няпоўная сярэдняя адукацыя давалася ў мужчынскіх і жаночых прагімназіях. У другой палове XIX ст. сярэдняя адукацыя развівалася вельмі марудна. У 1880 г. у Беларусі дзейнічала толькі 8 гімназій і 5 прагімназій, а агульная колькасць служачых, уключаючы выкладчыкаў, складала 292 чалавекі. У 1871/72 гг. рэальныя гімназіі былі пераўтвораны ў рэальныя вучылішчы, і ў 1888 г. яны набылі статус агульнаадукацыйных сярэдніх навучальных устаноў. З пачатку XX ст. павялічылася колькасць дзяржаўных і прыватных сярэдніх навучальных устаноў, як мужчынскіх, так і жаночых. У 1914 г. у Віленскай навучальнай акрузе працавала 31 мужчынская гімназія (731 служачы), 42 жаночыя (1147 служачых) і 11 рэальных вучылішчаў (280 служачых) [11]. Усяго ва ўрадавых і прыватных сярэдніх навучальных ўстановах мелі магчымасць набыць адукацыю толькі 31 328 чалавек [3, с. 380]. Устаноўленыя правілы і палажэнні абмяжоўвалі і перашкаджалі набыць неабходную адукацыю і заняць належнае месца ў грамадстве выхадцам з разначыннага асяроддзя, пакідаючы за дваранствам прывілею на дастойную адукацыю.

Такім чынам, для народных мас адукацыя, як правіла, абмяжоўвалася пачатковай школай і элементарным узроўнем ведаў, што, як лічылі міністэрскія чыноўнікі, адпавядала іх патрабаванням і ўмовам простага побыту, а таксама матэрыяльным магчымасцям. Такая ўстаноўка супадала з галоўнай задачай выхавання «сялянскіх юнакоў у духу хрысціянскай веры і маралі і ў адданасці Прастолу і Айчыне» [12, с. 28]. Акрамя гэтага, школа мела яшчэ і «прыватныя мэты, абумоўленыя гістарычным лёсам гэтага краю, яго гістарычным мінулым, а таксама і цяперашнім яго становішчам, як непадзельнай часткі Вялікай Расіі» [13, с. 32].

Палітыка ўрада ў Беларусі ў дачыненні да настаўнікаў праводзілася так, каб сфарміраваць адпаведнага «ідэальнага» працаўніка ў народнай адукацыі. Ідэал уяўляўся расійскаму школьнаму кіраўніцтву ў выглядзе талерантнага, сціплага, непрыкметнага працаўніка, які добра ўсведамляў важнасць настаўніцкага абавязку і аддана служыў царкве і царскаму трону [14, с. 54]. Асноўныя накірункі адукацыйнай і кадравай палітыкі непасрэдна залежалі ад канкрэтнай палітычнай сітуацыі, у тым ліку ступені нарастання і актывізацыі нацыянальна-вызваленчага руху.

Рэвалюцыя 1905–1907 гг. абудзіла свядомасць і адказнасць за лёс народнай адукацыі ў асяроддзі перадавых і прагрэсіўна настроеных настаўнікаў, разгарнуўся шырокі

грамадска-педагагічны і вучнёўскі рух, удзельнікі якога атрымлівалі карысны палітычны вопыт і паступовае ўсведамленне неабходнасці разбурэння застарэлых падыходаў да школьнага будаўніцтва. Падчас рэвалюцыі актывізаваўся працэс стварэння палітычных партый, якія ўключаліся ў барацьбу за ўладу. Яны фарміравалі ўласныя праграмы, у якіх непасрэдная ўвага ўдзялялася пытанням абнаўлення школы і ўсяго вучэбна-выхаваўчага працэсу. Ва ўмовах рэвалюцыйнага ўздыму 1905–1907 гг. царызм быў вымушаны часова задаволіць патрабаванні грамадства ў галіне асветы. Станоўчай з'явай у жыцці школы стала пашырэнне сеткі пачатковых народных вучылішчаў. У пачатку 1907 г. Дзяржаўная Дума прыступіла да абмеркавання прапанаванага Міністэрствам народнай асветы праекта аб увядзенні ўсеагульнага пачатковага навучання. У якасці важных фактараў дэмакратычнага абнаўлення сярэдняй адукацыі варта адзначыць юрыдычнае ўраўнаважванне ўрадавых і прыватных сярэдніх навучальных устаноў, скасаванне пераводных экзаменаў для вучняў, перагляд вучэбных планаў і з'яўленне магчымасці для выпускнікоў рэальных вучылішчаў паступаць ва ўніверсітэты. Новай рысай у палітыцы царызму стаў дазвол выкладання Закона Божага рымска-каталічаскага веравызнання ў пачатковай і сярэдняй школе на роднай мове на аснове пісьмовых заяў бацькоў. У гэты час разгарнуўся рух за стварэнне бацькоўскіх камітэтаў і сходаў.

Пад уплывам перадавой педагагічнай думкі, галоўным арыенцірам якой сталі прынцыпы дэмакратыі і гуманізму, пашыраліся і паляпшаліся змест і метады навучання. Важным фактарам стала наладжванне кантактаў нашых настаўнікаў з замежнымі калегамі, шырокае пранікненне на расійскі кніжны рынак і ў педагагічныя бібліятэкі прац прагрэсіўных вучоных, іх папулярызацыя праз айчынныя часопісы. Усё часцей з'яўляліся артыкулы, якія ўздымалі праблемы стварэння нацыянальнай школы. Пэўныя зрухі ў галіне народнай адукацыі былі таксама звязаны з павышэннем тэарэтычнай і метадычнай кваліфікацыі настаўніцтва праз арганізацыю настаўніцкіх курсаў, нарад і сходаў. Працягвалася стварэнне і развіццё педагагічных прафесійных арганізацый, якія стаялі ў вытоках аб'яднання настаўнікаў на прынцыпе дэмакратычнага абнаўлення народнай асветы і фарміравання новых падыходаў мадэрнізацыі царскай школы.

Часова царызм праяўляў цярплівасць і гнуткасць. У новых умовах пасля паражэння рэвалюцыі 1905–1907 гг. урадавая лінія ў школьным пытанні фарміравалася пад дамінуючым уплывам праваканcерватыўных сіл, якія выступалі за «здаровую рускую нацыянальную школу» пад кіраўніцтвам і наглядам царквы і ўрада. Гэтая лінія была накіравана на ліквідацыю дэмакратычных заваёў у галіне адукацыі, узмацненне цэнтралізаванага кантролю за школай і палітычнай добранадзейнасцю настаўнікаў, рэанімацыю царкоўных школ [15, с. 20]. Сілы рэакцыі абрушыліся на вынішчэнне ў навучальных установах рэвалюцыйных настрояў: прыцясняліся і звальняліся з працы найбольш актыўныя настаўнікі, выключаліся за ўдзел у хваляваннях вучні. Хваля адміністрацыйных ганенняў абрушылася на прыватныя сярэднія навучальныя ўстановы, бацькоўскія камітэты, павялічыўся інстытут школьнай інспекцыі. Аднаўляліся пільны ўнутрышкольны рэжым і пазашкольны нагляд, пераводныя экзамены, узмацнілася цэнзура за педагагічнымі выданнямі і г. д.

Але рэакцыя аказалася не здольнай павярнуць назад плынь грамадскай энергіі, перайначыць свядомасць, выкараніць прагрэсіўныя думкі і практыкі настаўніцтва. Пераадольваючы бюракратычныя перашкоды, грамадска-педагагічны рух набывае новыя накірункі, формы і метады барацьбы за абнаўленне сістэмы адукацыі.

Пытанні рэарганізацыі сістэмы адукацыі не былі вырашаны. Многія прадстаўнікі прагрэсіўных колаў працягвалі трымацца думкі Пурышкевіча: «Каб не было ў Расіі рэвалюцыі і ўмацоўвалася праваслаўная вера – гнаць настаўнікаў і на іх месца прызначаць салдат» [16, с. 301]. Толькі нязначныя крокі наперад зрабіў Часовы ўрад пасля Лютаўскай рэвалюцыі, але істотных змен і рэформаў так і не адбылося. Мнагатыпная сістэма адукацыі паранейшаму знаходзілася пад бюракратычнай апекай. Былі праведзены толькі некаторыя мерапрыемствы ў інтарэсах буржуазіі: скасаваны нацыянальныя і рэлігійныя абмежаванні пры паступленні ва ўсе навучальныя ўстановы, а таксама цыркуляры аб забароне ўдзелу настаўнікаў і навучэнцаў у палітычнай дзейнасці [3, с. 342]. Апякун Віленскай акругі заклікаў усіх работнікаў адукацыі захоўваць былы парадак і спакой, а навучальныя ўстановы перасцярог «ад усіх выпадковасцяў і эксцэсаў» [17, с. 251].

Але развіццё капіталізму ў Расіі штурхала ўрад на пэўныя крокі ў пашырэнні народнай адукацыі. І зроблена было шмат. Калі ў 1856 г. ў Віленскай акрузе было толькі 830 навучальных устаноў з 22 607 навучэнцамі, то на 1 студзеня 1911 г. – 10 287 навучальных устаноў з 544 663 навучэнцамі. За 54 гады колькасць навучальных устаноў узрасла ў 12,4 разу, а навучэнцаў – у 24,1 разу [18, с. 13]. У 1897 г. у межах сучаснай Беларусі пісьменных мужчын было 36,4%, жанчын –

15,2%; пісьменныя складалі 25,7% [19, с. 108]. Яшчэ ў 1868 г. паказчык асветы (лік вучняў на 100 чалавек насельніцтва) у губернях Віленскай акругі быў 1,05, а ў 1894 г. у дачыненні да міністэрскіх школ ён узрос да 2,24, у той час як у земскіх губернях ён складаў 3,12, а па ўсёй еўрапейскай Расіі ў сярэднім 2,93 [20, с. 93].

**Заключэннне.** Без грамадскага ўздыму пачатку XX ст. барацьба супраць старой школы і архаічнай сістэмы выхавання не магла прэтэндаваць на поспех. Гэты рух непасрэдна ўплываў на эвалюцыю адукацыйнай палітыкі, якая праводзілаася царызмам у мэтах прыстасавання асветы да патрэб кіруючых слаёў грамадства. Урад працягваў весці барацьбу з тайным навучаннем, забараняў атрыманне адукацыі на роднай мове, усяляк імкнуўся стрымаць ініцыятыву наельніцтва і земскіх устаноў у развіцці сеткі навучальных устаноў.

Адукацыйная палітыка царызму ў пачатку XX ст. відавочна не адпавядала актуальным патрабаванням часу, характарызавалася двaістасцю і непаслядоўнасцю. Усе нерашучыя захады і мерапрыемствы ў галіне асветы не змаглі дапамагчы кіруючым колам зняць напружанасць, вырашыць наспелыя вострыя сацыяльныя супярэчнасці ў грамадстве. Уплывовым фактарам грамадска-культурнага жыцця краіны з'яўляўся грамадска-педагагічны рух. Патрабаванні карэннай рэарганізацыі сістэмы адукацыі, якія актыўна падымаліся перадавымі коламі грамадства і прагрэсіўнымі педагогамі, становяцца ў шэраг найважнейшых агульнадэмакратычных патрабаванняў.

**Спіс літаратуры**


1. Статистические сведения по начальному образованию в Российской империи / под ред В. И. Формаковского. С-Петербург: тит. Акц. общ. печатного и писчебумажного дела «Слово», 1902. Вып. 3. 200 с.

2. Кириллов М. К. Начальная школа Белоруссии во второй половине XIX и в начале XX в. (1860–1907) // Из истории школы Белоруссии и Литвы / отв. ред. В. З. Смирнов. М.: Просвещение, 1964. С. 7–179.

3. Асвета і педагагічная думка ў Беларусі: Са старажытных часоў да 1917 г. / М. А. Ткачоў [і інш.], пад рэд М. А. Лазарука. Мінск: Народная асвета, 1985. 464 с.

4. Статистические сведения по начальному образованию за 1904 год. С-Петербург: тип. П. П. Сойкина, 1906. 61 с.

5. Статистические сведения по начальному образованию в Российской империи / под ред. В. И. Формаковского, А. А. Шапеллина. Одесса: тип. К. И. Фесенко, 1907. Вып. 6. 312 с.

6. Жалование народного учителя // Народное образование в Виленском учебном округе. 1907. № 11. С. 436.

7. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). Ф. 2519. Воп. 1. Спр. 15.

8. Могилевское земство и народное образование // Народное образование в Виленском учебном округе. 1914. № 3. С. 138–141.

9. Местная хроника // Народное образование в Виленском учебном округе. 1914. № 2. С. 27–89.

10. НГАБ. Ф. 2084. Воп. 1. Спр. 131.

11. Отчет по управлению Виленским учебным округом за 1914 г. Вильна: тип. А. Г. Сыркина, 1915.

12. Тихомиров Д. Задачи народной школы // Народное образование в Виленском учебном округе. 1901. № 1. С. 27–32.

13. Одинцов Н. Частные задачи народной школы в С-Западном крае // Народное образование в Виленском учебном округе. 1901. № 1. С. 32–40.

14. Снапкоўская С. В. Адукацыйная палітыка і школа на Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. Мінск: НІА, 1998. 191 с.

15. Тебиев Б. К. Правительственная политика в области образования и общественно-педагогическое движение в России конца XIX – начала XX в.: автореф. дис. ... д-ра пед. наук. М., 1991. 29 с.

16. Антология педагогической мысли Белорусской ССР / сост. Э. К. Дорошевич [и др.] М.: Педагогика, 1986. 462 с.

17. НГАБ. Ф. 2254. Воп. 2. Спр. 928.

18. Снапкоўская С. В. Асвета на Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. // Адукацыя і выхаванне. 1997. № 8. С. 11–24.

19. Улащик Н. Н. Грамотность в дореволюционной Белоруссии // История СССР. 1968. № 1. С. 106–116.

20. Сцяпура З. Стан народнай асветы на Беларусі да вайны 1914 года // Асвета. 1927. № 7. С.92–98.

## References

1. *Statisticheskiye svedeniya po nachal'nomu obrazovaniyu v Rossiyskoy imperii* [Statistische Informationen zur Grundbildung im Russischen Reich]. Ed. by V. I. Formakovskiy. St. Petersburg, tit. Akts. Obshch. pechatnogo i pischebumazhnogo dela "Slovo" Publ., 1902, issue 3. 200 p. (In Russian).

2. Kirillov M. K. Elementary school of Belarus in the second half of the nineteenth and early twentieth centuries (1860–1907). *Iz istorii shkoly Belorussii i Litvy* [From the history of the school of Belarus and Lithuania]. Ed. V. Z. Smirnov. Moscow, Prosveshcheniye Publ., 1964, pp. 7–179 (In Russian).

3. Tkachou M. A., Pase U. S., Syan'kevich G. R. *Asveta i pedagagichnaya dumka u Belarusy: Sa starazhytnykh chasou da 1917 g.* [Enlightenment and pedagogy of thought in Belarus: from ancient times to 1917]. Ed. by M. A. Lazaruk. Minsk, Narodnaya asveta Publ., 1985. 464 p. (In Belarusian).

4. *Statisticheskiye svedeniya po nachal'nomu obrazovaniyu za 1904 god* [Statistical data on primary education for 1904]. St. Petersburg, tip. P. P. Soykina Publ., 1906. 61 p. (In Russian).

5. Formakovskiy V. I., Shapellin A. A. *Statisticheskiye svedeniya po nachal'nomu obrazovaniyu v Rossiyskoy imperii* [Statistical data on primary education in the Russian Empire]. Odessa, tip. K. I. Fesenko Publ., 1907, issue 6. 312 p. (In Russian).

6. Salary of the national teacher. *Narodnoye obrazovaniye v Vilenskom uchebnom okruge* [Public education in the Vilna School District], 1907, no. 11, pp. 436 (In Russian).

7. National Historical Archives of Belarus (NHAB). Fund 2519. I. 1. F.15.

8. Mogilev Zemstvo and public education. *Narodnoye obrazovaniye v Vilenskom uchebnom okruge* [Public education in the Vilna School District], 1914, no. 3, pp. 138–141 (In Russian).

9. Local chronicle. *Narodnoye obrazovaniye v Vilenskom uchebnom okruge* [Public education in the Vilna School District], 1914, no. 2, pp. 27–89 (In Russian).

10. NHAB. Fund 2084. I. 1. F. 131.

11. *Otchet po upravleniyu Vilenskim uchebnym okrugom za 1914 g.* [Report on the management of the Vilna School District for 1914]. Wil'no, tip. A. G. Syrkina Publ., 1915 (In Russian).

12. Tikhomirov D. Tasks of the folk school. *Narodnoye obrazovaniye v Vilenskom uchebnom okruge* [Public education in the Vilna School District], 1901, no. 1, pp. 27–32 (In Russian).

13. Odintsov N. Private tasks of the public school in the S-Western Territory. *Narodnoye obrazovaniye v Vilenskom uchebnom okruge* [Public education in the Vilna School District], 1901, no. 1, pp. 32–40 (In Russian).

14. Snapkouskaya S. V. *Adukatsyynaya palityka i shkola na Belarusi ў kantsy XIX – pachatku XX st.* [Educational policy and school in Belarus at the end of the 19th – beginning of the 20th century]. Minsk, NIA Publ., 1998. 191 p. (In Belarusian).

15. Tebiev B. K. *Pravitel'stvennaya politika v oblasti obrazovaniya i obshchestvenno-pedagogicheskoye dvizheniye v Rossii kontsa XIX – nachala XX v. Avtoreferat dissertatsii doktora pedagogicheskih nauk* [Government policy in the field of education and the socio-pedagogical movement in Russia of the late XIX – early XX century. Abstract of thesis DSc (Pedagogical)]. Moscow, 1991. 29 p. (In Russian).

16. Doroshevich E. K. *Antologiya pedagogicheskoy mysli Belorusskoy SSR* [Anthology of pedagogical thought of the Belarusian SSR]. Moscow, Pedagogika Publ., 1986. 462 p. (In Russian).

17. NHAB. Fund 2454. I.2. F. 928.

18. Snapkouskaya S. V. Education in Belarus in the late XIX – early XX century. *Adukatsyya i vykhavanne* [Education and upbringing], 1997, no. 8, pp. 11–24 (In Belarusian).

19. Ulashchik N. N. Literacy in pre-revolutionary Belorussia. *Istoriya SSSR* [History of the USSR], 1968, no. 1, pp. 106–116 (In Russian).

20. Stsyapura Z. The camp of people's asvety in Belarus and the wars of 1914. *Asveta* [Education], 1927, no. 7, pp. 92–98 (In Belarusian).

## Інфармацыя пра аўтара

**Астрога Валянціна Міхайлана** – кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і паліталогіі. Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт (220006, г. Мінск, вул. Свярдлова, 13а, Рэспубліка Беларусь). E-mail: ostroha@belstu.by

## Information about the author

**Ostroga Valentina Mikhailovna** – PhD (History), Associate Professor, Assistant Professor, the Department of History of Belarus and Political Science. Belarusian State Technological University (13a, Sverdlova str., 220006, Minsk, Republic of Belarus). E-mail: ostroha@belstu.by

*Паступіў 12.09.2022*